*І.У. **Вішнеўская**, канд. гіст. навук*
БДЭУ (Мінск)

# КАНЦЭПЦЫІ МІЖКАНФЕСІЙНАЙ УНІІ Ў ПАЛІТЫКА-ПРАВАВОЙ ДУМЦЫ БЕЛАРУСІ XVI ст.

Царкоўная унія 1596 г. стала пераломнай падзеяй усходнеславянскай канфесійнай гісторыі. Яна адлюстравала многія з тых праблем і супярэчнасцяў, якімі жыло беларускае грамадства з канца XIV ст. з моманту прыняцця і распаўсюджання каталіцтва. Вытокі ідэі уніі паміж дзвюма хрысціянскімі царквамі былі звязаны з геапалітычным становішчам ВКЛ. Знаходзячыся ў самым цэнтры Еўропы, на памежжы каталіцкага Захаду і праваслаўнага Усходу, дзяржава імкнулася нейтралізаваць адмоўныя вынікі ідэалагічнага супрацьстаяння дзвюх хрысціянскіх канфесій. Вялікія князі, як палітыкі, разумелі, што бірэлігійнасць насельніцтва княства хавае ў сабе пэўную сацыяльна-палітычную небяспеку. Таму ўжо з 1396 г. пачынаюць звяртацца за падтрымкаю уніі да вышэйшых іерархаў праваслаўнай і каталіцкай цэркваў — канстанцінопальскага патрыярха і Папы Рымскага.

Пытанне аб уніі ставіцца главой царкоўнай дэлегацыі ВКЛ Рыгорам Цамблакам у 1418 г. на XVI Усяленскім саборы каталіцкай царквы ў Канстанцы (Германія). Ідэя рэлігійнай згоды праз унію падтрымлівалася адукаванымі грамадскімі і царкоўнымі дзеячамі, якія верылі ў магчымасць праз унію дасягнуць грамадскага і канфесійнага міру ў дзяржаве, аб'яднаць грамадства, абараніць суверэннасць дзяржавы.

У XIV—XV стст. ідэя уніі не была рэалізавана, але яна не згінула, а набыла новае жыццё ў другой палове XVI ст., чаму садзейнічаў шэраг фактараў геапалітычнага, духоўна-культурнага і рэлігійна-царкоўнага характару.

У 60—90-я гг. XVI ст. праблема уніі зноў стала прадметам абмяркавання ў асяроддзі свецкай і духоўнай эліты грамадства ВКЛ. Прычынаю стала, у першаю чаргу, імкненне да гегемоніі ў гэтым рэгіене дзвюх вялікіх палітычных сіл — Польшчы і Маскоўскай дзяржавы.

Польская карона жадала праз унію ў межах ВКЛ парушыць яго традыцыйныя сувязі з хрысціянскім усходам і дасягнуць дзяржаўнай монаканфесійнасці, якая бачылася падмуркам цэласнасці і трываласці Рэчы Паспалітай. Масква, пасля абвяшчэння патрыярхіі ў 1589 г., упэўнена лічыла сябе «трэцім Рымам», што рабіла, з яе пункту гледжання, абгрунтаванымі прэтэнзіі на землі ВКЛ, заселеныя праваслаўным насельніцтвам.

На наш погляд, пастаноўка праблемы канфесійнай рэформы была звязана таксама з працэсам вялікакняскага адраджэння, які прышоўся на 70—90-я гг. XVI ст. і меў на мэце ўзнаўленне дзяржаўных і прававых інстытутаў, мацаваўшых суверэннасць ВКЛ у паслялюблінскі перыяд. Менавіта ў гэты час аднаўляецца дзейнасць княскіх парламенцкіх інстытутаў (перадсоймавыя і паслясоймавыя соймікі, Віленская

канвакацыя), пачынае дзейнічаць вышэйшая судовая інстанцыя — Галоўны суд (Трыбунал) ВКЛ, прымаецца трэці Статут (1588 г.). Утварэнне новай хрысціянскай канфесіі — уніяцкай — магло б вырашыць праблему канфесійнага кансэнсуса і стварыць грунт для палітычнай незалежнасці дзяржавы праз незалежнасць царкоўную.

Тры праекты уніі паміж праваслаўнай і каталіцкай царквамі, якія сталі прадметам грамадскага абмеркавання, належылі асобам, што прадстаўлялі інтарэсы асноўных палітычных сіл дзяржавы. Петр Скарга адлюстроўваў спадзяванні Ватыкана на распаўсюджанне праз ВКЛ каталіцызма на Усход. Канцэпцыя уніі, прапанаваная Скаргай, адпавядала інтарэсам польскай палітычнай эліты па ўмацаванню дзяржаўнай маналітнасці і магутнасці Рэчы Паспалітай і разглядалася як працяг уніі дзяржаўнай. Згодна з праектам П. Скаргі рэгіянальная унія павінна падпарадкаваць праваслаўную царкву ВКЛ Папе Рымскаму, але на пэўны тэрмін захаваць у ей абрады і набажэнства грэчаскай веры, якія не супярэчаць каталіцкай дагматыцы. П. Скарга бачыў ва уніяцкай царкве часовую канфесію, якая павінна была садзейнічаць паступоваму пераходу праваслаўнага насельніцтва ў каталіцкую царкву і зрабіць гэты пераход меньш балючым для вернікаў.

Канстанцін Астрожскі, лідэр праваслаўнай партыі, імкнуўся праз унію да аднаўлення ўсходняй царквы, вяртання ёй былой моцы, пашырэння культуры і адукацыі сярод праваслаўнага насельніцтва ВКЛ, надання праваслаўнаму духавенству і праваслаўнай шляхце права ўдзельнічаць у дзяржаўным кіраванні. Ён быў прыхільнікам ідэі ўсеагульнай універсальнай уніі з ўсімі праваслаўнымі царквамі (маскоўскай, канстанцінопальскай, валажскай), а таксама пратэстантамі (евангелікамі).

Такім чынам, канцэпцыя К. Астрожскага не прадугледжвала стварэння новай канфесіі на падставе царкоўнага аб’яднання, а хутчэй нагадвала пагадненне, дамову паміж хрысціянскімі канфесіямі з мэтаю захавання міра, згоды, стабільнасці ў хрысціянскім свеце ўвогуле і ў шматканфесійнай Рэчы Паспалітай у прыватнасці.

І ў рэшце рэшт, праект праваслаўнага епіскапа І. Пацея меў на мэце стварэнне незалежнай і ад праваслаўнага маскоўскага, і ад каталіцкага польскага цэнтраў па сутнасці новай хрысціянскай канфесіі, якая б стала падмуркам умацавання дзяржаўнай незалежнасці ВКЛ ад Польскай Кароны. Лагічным працягам ідэі Пацея стаў праект уніяцкага патрыяршаства, распрацаваны яго наступнікам па уніяцкай мітрапалічай кафедры Я. Руцкім. На думку прыхільнікаў ідэі уніяцкага патрыярхата, гэта рэформа садзейнічала б вывядзенню уніяцкай царквы ВКЛ з падпарадкавання Папе Рымскаму. Мы лічым, што лагічна разглядаць Берасцейскую унію як адно з мерапрыемстваў працэса вялікакняскага адраджэння, накіраванага на замацаванне аўтаномнага статуса ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай. І невыпадкова праект І. Пацея атрымаў падтрымку ва ўладных колах ВКЛ. Гарачым прыхільнікам яго стаў канцлер ВКЛ Леў Сапега.



Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by